**ПАВАГА ДА МІНУЛАГА ЯК НАДЗЕЙНЫ ГАРАНТ СТАБІЛЬНАЙ БУДУЧЫНІ**

Дарагія ўдзельнікі канферэнцыі, замежныя госці, выкладчыкі, супрацоўнікі, аспіранты, магістранты, студэнты і выпускнікі ўніверсітэта, калегі з навукова-даследчых цэнтраў і іншых навучальных устаноў, пераемнікі і носьбіты фальклору! Мне, як заўжды, прыемна звярнуцца да вас з нагоды адкрыцця XI Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай аўтэнтычнаму фальклору, правядзенне якой у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў за апошняе дзесяцігоддзе паспела стаць добрай традыцыяй!

Фальклор існуе на працягу тысячагоддзяў і з'яўляецца адным са сродкаў ідэнтыфікацыі кожнага народа ў прасторы сучаснай сусветнай культуры. Сёння, калі наша краіна ўсё больш актыўна становіцца не аб'ектам, а суб'ектам міжнародных культурных і палітычных адносін, адчувальна расце ўвага грамадства цалкам і даследчыкаў-навукоўцаў розных адгалінаванняў навукі да каранёвых традыцый беларусаў, матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны іх культуры.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў ад стварэння ў 1975 годзе з'яўляецца значным цэнтрам вывучэння, рэканструкцыі і захавання створаных нашымі продкамі ведаў, уменняў, творчых мастацкіх прыёмаў, абрадаў, свят і іншых каштоўнасцей мінулага. Вялікае значэнне для фарміравання этнаідэнтыфікацыі сучаснага чалавека мае жыццёвая мудрасць, этыка, экалагічнасць светапогляду нашых продкаў, выпрацаваныя стагоддзямі.

Ва ўніверсітэце не толькі цікавяцца традыцыйнай беларускай культурай, але і шануюць яе. Увага надаецца мэтанакіравана практычнай падрыхтоўцы спецыялістаў у розных галінах беларускага народнага мастацтва (народныя спевы, народны танец, народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і рэстаўрацыя яго артэфактаў, народны тэатр, дударская музыка, народныя святы), спецыялістаў-практыкаў у галіне этналогіі і фальклору.

Не спыняецца ў нас мэтанакіраваная праца па рэканструкцыі, навуковым апісанні і інтэрпрэтацыі народнай культуры. Сярод славутых імен нашых фалькларыстаў узгадаем даследчыкаў з нашай alma mater Міколу Грынчыка, Івана Цішчанку, Уладзіміра Грома. У напрамку дзейнасці гэтых, сёння ўжо напалову легендарных руплівцаў беларушчыны, універсітэт выдае манаграфіі і зборнікі работ, забяспечвае абароны магістарскіх, кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Сярод апошніх абарон варта асабліва адзначыць кандыдацкую дысертацыю Алеся Сурбы, прысвечаную дударскай культуры, многія аспекты якой агучваліся на канферэнцыях, прысвечаных аўтэнтычнаму фальклору. Навуковы аналіз гістарычнага і сучаснага стану традыцыйнай беларускай культуры дае падставу для вызначэння прыярытэтаў культурнага і грамадскага развіцця нашай краіны, вырашэння актуальных праблем адукацыі, выхавання, інкультурацыі, інфармацыйнай і культурнай бяспекі, экалогіі, дэмаграфіі і іншых.

Наш універсітэт славуты сваімі мастацкімі калектывамі, у творчай дзейнасці якіх знайшлі ўвасабленне разнастайныя з'явы і формы каранёвай культуры беларусаў. Прыкладам з'яўляецца вакальна-харэаграфічны ансамбль «Валачобнікі» імя Станіслава Дробыша, капэла беларускіх народных духавых інструментаў «Гуды» імя Уладзіміра Грома, ансамбль «Грамніцы» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Зяневіча, ансамбль кафедры харэаграфіі пад кіраўніцтвам Святланы Гуткоўскай, ансамбль беларускай музыкі «Талака» пад кіраўніцтвам Вячаслава Калацэя і многія іншыя.

Уся шматгранная праца па вывучэнні, захаванні і развіцці традыцыйнай беларускай культуры, якая ажыццяўляецца ва ўніверсітэце, робіцца пры падтрымцы дзяржавы, за што мы ёй вельмі ўдзячныя. Створаныя дзяржавай умовы для ўключэння нацыянальнай культурнай спадчыны ў жыццё сучаснага грамадства спрыяюць дзейнасці ўніверсітэта як асяродка вывучэння і выкарыстання здабыткаў традыцыйнай мастацкай культуры, а таксама як крыніцы кадравага забеспячэння гэтай дзейнасці.

Сёння вам як людзям, якія забяспечваюць сувязь павагі грамадстваў XXI стагоддзя да свайго мінулага з імкненнем да іх стабільнай будучыні, варта пажадаць плённай працы, новых адкрыццяў ва ўсіх галінах навукі, якія прысвечаны народазнаўству: у *этналогіі, філалогіі, аўдыявізуальнай антрапалогіі, мастацтвазнаўстве, культуралогіі*. Я сардэчна жадаю плёну ўсім айчынным удзельнікам канферэнцыі, нашым гасцям з суседніх сяброўскіх краін, фальклорным калектывам, якія завіталі да нас і бяруць удзел як у навуковай рабоце, так і ў практычнай частцы канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» 2017 года!

Прафесар, рэктар
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Юрый Бондар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ